Сітуацыя

# Вакцынацыя дамашняй жывёлы, забарона на вываз

## У Пінскім раёне каранцін па шаленстве аб'яўлены яшчэ ў адной вёсцы

**Пінскі райвыканкам сваім рашэннем увёў каранцін у вёсцы Беразцы пасля нядаўняга здарэння. На падворак да аднаго з вяскоўцаў прыбегла ліса і накінулася на сабаку. Як і меркавалася, звер аказаўся хворы на шаленства.**

Не так даўно ў згаданым раёне воўк напаў на людзей. Нагадаю, у пачатку гэтага месяца ў вёсцы Ласіцк адбылося надзвычайнае здарэнне. Воўк з'явіўся на ўскраіне вёскі надвячоркам і адразу напаў на дзвюх жанчын, якія ішлі па дарозе. На крык прыбеглі мужчыны, віламі і палкамі адагналі звера. Але драпежнік вельмі хутка прыйшоў у вёску з іншага боку і пакусаў яшчэ адну жанчыну. Адразу была наладжана аблава, на другі дзень звера застрэлілі ў Столінскім раёне. А вось жанчын давялося тэрмінова шпіталізаваць.

Паводле слоў **старшыні Ласіцкага сельскага Савета Алены СІНЮЦІЧ,** усе тры пацярпелыя жыхаркі вёскі выпісаліся з бальніцы і вярнуліся да звыклага жыцця. Менш пацярпелі 22-гадовая і 50-гадовая вяскоўкі, яны хутка паправіліся, а вось 40-гадовая жанчына атрымала рваныя раны, ёй давялося прайсці курс лячэння ў хірургічным аддзяленні. На яе драпежнік накінуўся знянацку і літаральна зваліў з ног. Акрамя цялесных пакалечанняў, жанчына атрымала моцны стрэс, справіцца з наступствамі якога не так проста. Усім ім, несумненна, пасля такога здарэння патрабуецца псіхалагічная дапамога.

— У вёсцы ўведзены каранцін на два месяцы, — працягвае кіраўнік мясцовай улады. — Спецыялісты раённай ветэрынарнай службы прыбылі да нас літаральна адразу. Былі праведзены падворныя абходы насельніцтва, праведзены гутаркі. Усе дамашнія сабакі і каты былі прышчэплены ад шаленства. Людзі ўспрынялі каранцінныя абмежаванні з разуменнем. На гэты час забараняецца ўвоз і вываз з населенага пункта сабак і катоў.

Не прайшло і двух тыдняў пасля названага здарэння, як у вёсцы Беразцы Парахонскага сельсавета людзі зноў сутыкнуліся з выпадкам шаленства дзікага звера. Ліса сярод белага дня прыйшла на падворак і напала на сабаку. Гаспадар, на шчасце, быў дома і закалоў драпежніцу віламі. Пасля правядзення адпаведнай экспертызы атрымана заключэнне аб хваробе на шаленства лісіцы. Сабака, на якога ліса напала, аказаўся прышчэплены, для прафілактыкі правялі рэвакцынацыю.

Адразу ж рашэннем райвыканкама вёска Беразцы была аб'яўлена каранціннай зонай па шаленстве на два месяцы. **Галоўны ветурач Пінскай раённай ветэрынарнай станцыі Барыс КАПЦЮХ** паведаміў «Звяздзе», што першапачаткова тэрмін каранціну ўстаноўлены на два месяцы. Далей раённая ветслужба прыме рашэнне аб тым, зняць абмежаванні ці прадоўжыць іх.

— У дадзены час правяраецца выкананне правілаў утрымання сабак і катоў. Пры неабходнасці дамашнія жывёліны праходзяць вакцынацыю, — адзначыў Барыс Капцюх. — Пры гэтым узмацняецца кантроль за бяздомнымі жывёлінамі, праводзіцца іх адлоў. Паляўнічыя арыентаваныя на адстрэл дзікіх жывёлін — лісіцы, ваўка, янотападобнага сабакі. Забаронены гандаль дамашняй жывёлай, перадача яе ў іншыя населеныя пункты. Маюцца на ўвазе, вядома, найперш сабакі і каты. Скажам, прадаць буйную рагатую жывёлу сельскі жыхар можа.

Спецыяліст яшчэ раз нагадаў аб неабходнасці своечасовай вакцынацыі дамашніх гадаванцаў. Тады яны будуць абароненыя нават у выпадку сустрэчы з няпрошанымі гасцямі з лесу.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**